# *§ 59–0. Эканамічнае развіццё сучаснай Беларусі

ПРЫВАТЫЗАЦЫЯ
ІНФЛЯЦЫЯ
УСЕБЕЛАРУСКІ
НАРОДНЫ СХОД
АГРАГАРАДОК
«ШОКАВАЯ ТЭРАПІЯ»
РЫНАЧНАЯ ЭКАНОМІКА

**1. Беларуская мадэль эканамічнага развіцця.** Пасля абвяшчэння незалежнасці Рэспубліка Беларусь сутыкнулася з рэзкім пагаршэннем эканамічных паказчыкаў: ВУП у 1992 г. панізіўся на 9,2 %, у 1993 г. — на 7,6 %, у 1994 г. — на 11,7 %, прамысловая вытворчасць — на 9,2, 9,4 і 14,6 % адпаведна, інвестыцыі ў асноўны капітал — на 29, 15 і 11 % адпаведна. Спад вытворчасці спалучаўся з ростам інфляцыі. Рэальныя даходы насельніцтва за адзін толькі 1992 г. паменшыліся на 19 %.

Палажэнне аб неабходнасці захаваць эканоміку Беларусі і на яе базе ўжо ў незалежнай дзяржаве развіваць прамысловы патэнцыял, сельскую гаспадарку і сферу паслуг зрабілася ключавым тэзісам А. Р. Лукашэнкі ў яго перадвыбарнай прэзідэнцкай праграме.

Пра беларускую мадэль **сацыяльна арыентаванай рыначнай эканомікі** было ўпершыню заяўлена ў Асноўных кірунках сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 1996–2000 гг. Галоўнымі яе характарыстыкамі выступаюць вядучая роля дзяржавы ў эканамічным жыцці і забеспячэнне высокага ўзроўню сацыяльнай абароны грамадзян. Беларуская мадэль сацыяльна-эканамічнага

**Сацыяльна арыентаваная рыначная эканоміка** — мадэль эканамічнага развіцця, пры якой дзяржава адыгрывае вызначальную ролю ў рэгуляванні эканамічных працэсаў і фарміраванні ўмоў для забеспячэння патрэб насельніцтва.

| Асаблівасці беларускай мадэлі эканамічнага развіцця | |
|---|---|
| 1. Моцная і эфектыўная дзяржаўная ўлада, якая забяспечвае палітычную стабільнасць, сацыяльную справядлівасць і бяспеку | Дзяржаўнае рэгуляванне спрыяе развіццю эканомікі, забяспечвае яе стабільнасць і надзейнасць, а таксама сацыяльныя гарантыі для насельніцтва |
| 2. Роўнасць розных формаў уласнасці | Галоўны крытэрый развіцця эканомікі — эфектыўнасць вядзення гаспадаркі; прыватызацыя выступае не як самамэта, а як сродак пошуку зацікаўленых інвестараў |
| 3. Шматвектарнасць знешнеэканамічнай палітыкі ва ўмовах глабалізацыі гаспадарчых сувязей | Шматвектарная палітыка дазваляе пашырыць гандлёвыя і інвестыцыйныя магчымасці, паменшыць залежнасць ад аднаго рынку |
| 4. Актывізацыя інтэграцыйных працэсаў, перш за ўсё эканамічных, з Расіяй і краінамі СНД | Доступ да расійскага рынку з'яўляецца важным для беларускага экспарту і дапамагае падтрымліваць стабільнасць эканомікі. У рамках ЕАЭС забяспечваюцца свабода руху тавараў, паслуг, капіталу і рабочай сілы, правядзенне скаардынаванай палітыкі ў ключавых галінах эканомікі |
| 5. Моцная сацыяльная палітыка дзяржавы, інвестыцыі ў здароўе, адукацыю, прафесійнае і культурнае развіццё асобы, а таксама адрасная сацыяльная дапамога | Чалавек — цэнтральны аб'ект эканамічнай палітыкі. Сацыяльныя праграмы дзяржавы ў галіне адукацыі, аховы здароўя, аховы мацярынства і дзяцінства, абароны пажылога насельніцтва, развіцця фізкультуры і спорту складаюць сацыяльны сэнс беларускай мадэлі развіцця |

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, канкрэтызуйце фактамі асаблівасці беларускай мадэлі эканамічнага развіцця.

развіцця была замацаваная рашэннямі Усебеларускіх народных сходаў.

**Захады па стабілізацыі эканомікі**

**2. Стратэгічныя кірункі развіцця эканомікі.** Распрацаваная з ініцыятывы Прэзідэнта А. Р. Лукашэнкі ў 1994 г. «*Праграма неадкладных мер па выхадзе эканомікі Рэспублікі Беларусь з крызісу*» прадугледжвала комплекс радыкальных захадаў, накіраваных на стабілізацыю эканомікі краіны.

**Праграма неадкладных захадаў па выхадзе эканомікі Рэспублікі Беларусь з крызісу**

- Спыненне спаду вытворчасці і падзення жыццёвага ўзроўню народа;
- аздараўленне крэдытнай сістэмы;
- памяншэнне ўзроўню інфляцыі, стабілізацыя нацыянальнай валюты;
- удасканаленне аплаты працы;
- узмацненне дзяржаўнага рэгулявання эканомікі;
- строгі кантроль над прыватнай гаспадарчай дзейнасцю

Як дадзеныя захады маглі паспрыяць выхаду эканомікі з крызісу?

Першыя вынікі з'явіліся ўжо ў 1995–1996 гг.: удалося спыніць спад вытворчасці, пачалі расці рэнтабельнасць прамысловасці, экспарт тавараў і паслуг, памяншалася інфляцыя, расла заработная плата.

### Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця

У гэты перыяд беларуская дзяржава апроч вырашэння бягучых праблем перайшла да стратэгічнага планавання развіцця ў сацыяльна-эканамічнай сферы. За аснову было ўзятае планаванне па пяцігодках. Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця абмяркоўваліся на Усебеларускіх народных сходах. У кожнай Праграме былі вызначаныя прыярытэты развіцця рэспублікі на бліжэйшыя пяць гадоў.

**Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь**

| Гады | Прыярытэты развіцця |
|---|---|
| 1996–2000 гг. | Экспарт тавараў і паслуг, будаўніцтва жылля, развіццё аграпрамысловага комплексу |
| 2001–2005 гг. | Харчовая бяспека, экспарт, будаўніцтва жылля, развіццё інавацый і прыцягненне інвестыцый |
| 2006–2010 гг. | Інавацыйнае развіццё эканомікі, энерга- і рэсурсазберажэнне, адраджэнне вёскі, павышэнне канкурэнтаздольнасці беларускай прадукцыі, развіццё малых гарадоў |
| 2011–2015 гг. | Паляпшэнне інвестыцыйнага і бізнес-клімату, развіццё высокатэхналагічных вытворчасцей, рост экспарту |
| 2016–2020 гг. | Рост канкурэнтаздольнасці эканомікі, прыцягненне інвестыцый і інавацыйнае развіццё |
| 2021–2025 гг. | Шчаслівая сям'я, моцныя рэгіёны, інтэлектуальная краіна, дзяржава-партнёр |

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

**У якасці прыярытэтаў развіцця Беларусі ў 2021–2025 гг. былі вызначаныя шчаслівая сям'я, моцныя рэгіёны, інтэлектуальная краіна, дзяржава-партнёр.**

*Шчаслівая сям'я.* Гэта папулярызацыя традыцыйных сямейных каштоўнасцей. Сям'я з дзецьмі павінна стаць у нашым грамадстве не проста сацыяльнай нормай, а ідэалам сямейных адносін.

*Моцныя рэгіёны.* Маюцца на ўвазе эфектыўная занятасць, дастойныя даходы, высокая мабільнасць, камфорт і бяспека людзей ва ўсякім месцы Беларусі.

*Інтэлектуальная краіна.* Беларусь — гэта краіна разумных, адукаваных, творчых людзей, здольных здзяйсняць інавацыйныя прарывы і рухацца наперад.

*Дзяржава-партнёр.* Гэта выбудоўванне празрыстых, адкрытых, даверлівых адносін дзяржавы, грамадства і бізнесу.

1. *Правядзіце аналіз прыярытэтаў развіцця Рэспублікі Беларусь з 1996 да 2025 г. Дакажыце, што прыярытэты развіцця Рэспублікі Беларусь, сфармуляваныя ў кожнай Праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця, з'яўляюцца лагічным працягам выкананых задач, пастаўленых у папярэдняй Праграме.*
2. *Суаднясіце асноўныя прыярытэты развіцця Беларусі ў 2021–2025 гг. з тэндэнцыямі развіцця сучаснага свету (гл. Канцэпцыю нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь). Як вы лічыце, на якія выклікі сучаснага грамадства адказваюць прыярытэты сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі ў згаданы перыяд?*
3. *Якімі, на вашу думку, могуць быць прыярытэты сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі ў 2026–2030 гг.?*

### Вынікі рэалізацыі праграм сацыяльна-эканамічнага развіцця рэспублікі

Якія прыярытэты эканамічнага развіцця сведчаць пра сацыяльны характар беларускай дзяржавы?

Рэалізацыя праграм сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь забяспечвае рост нацыянальнай эканомікі, захаванне палітычнай стабільнасці, павышэнне ўзроўню і якасці жыцця людзей. Ужо ў 2000 г. у Рэспубліцы Беларусь быў перавышаны ўзровень дакрызіснага 1990 г. у найважнейшых эканамічных паказчыках. Валавы ўнутраны прадукт на душу насельніцтва на аснове парытэту (роўнасці) пакупніцкай здольнасці вырас з 15,4 тыс. долараў у 2010 г. да 20,2 тыс. долараў у 2020 г.

Асноўнае значэнне для развіцця эканомікі Беларусі мелі рашэнні Прэзідэнта А. Р. Лукашэнкі, накіраваныя на захаванне эканомікі нашай краіны, якая дасталася нам ад Савецкага Саюза, і развіццё на яе базе сучаснага прамысловага патэнцыялу, сельскай гаспадаркі, сферы паслуг.

Сёння Рэспубліка Беларусь — экспартаарыентаваная дзяржава з развітымі прамысловасцю, сектарам паслуг і сельскай гаспадаркай.

Найважнейшай адметнасцю беларускай эканомікі з'яўляецца яе сацыяльная арыентацыя, якая прадугледжвае недапушчэнне істотнага сацыяльнага расслаення грамадства, падтрыманне на належным узроўні сістэмы сацыяльнага забеспячэння, аховы здароўя, адукацыі і культуры. Сацыяльная накіраванасць беларускай сацыяльна-эканамічнай мадэлі выяўляецца ў даступнасці асноўных грамадскіх даброт для ўсіх колаў насельніцтва без выключэння. Дзяржава рэгулюе тарыфы на сацыяльна значныя даброты: жыллёва-камунальныя паслугі, тавары і паслугі (транспарт, энерганосьбіты) і г. д.

Развіццё прамысловай вытворчасці

**3. Найважнейшыя эканамічныя дасягненні Рэспублікі Беларусь у канцы XX — першай чвэрці XXI ст.** Да найважнейшых эканамічных дасягненняў суверэннай Рэспублікі Беларусь можна аднесці дастаткова высокі ўзровень развіцця прамысловай вытворчасці, якая фарміруе больш за чвэрць ВУП Беларусі.

У нашай краіне паспяхова развіваюцца машынабудаванне; вытворчасць прадуктаў харчавання; дрэваапрацоўчая, нафтахімічная і фармацэўтычная галіны прамысловасці; працуюць сотні прадпрыемстваў, якія вырабляюць аўтамабілі і аўтакампаненты, сельскагаспадарчыя машыны і станкі, складаныя прыборы, оптыку, электратэхнічнае абсталяванне, ліфты, бытавую тэхніку і электроніку. Рэспубліка Беларусь уваходзіць у шэраг лідараў сярод сусветных экспарцёраў грузавых аўтамабіляў, трактароў,

дарожна-будаўнічай і камунальнай тэхнікі. Прадукцыю нашых заводаў пастаўляюць больш чым у 65 краін свету.

**Мадэрнізацыя эканомікі на інавацыйнай аснове**

Беларуская эканоміка развіваецца на інавацыйнай аснове. Зацверджаная Дзяржаўная праграма інавацыйнага развіцця прадугледжвае ўвядзенне ў эксплуатацыю новых прадпрыемстваў, мадэрнізацыю рабочых месцаў.

**Развіццё ўласнай атамна-энергетычнай праграмы**

З мэтай забеспячэння энергетычнай бяспекі краіны рэспубліка развівае ўласную энергетычную праграму. У 2021–2023 гг. у Беларусі пабудавана першая атамная электрастанцыя. Дзякуючы БелАЭС наша краіна мае надзейную крыніцу экалагічна чыстай электраэнергіі; пасля яе запуску Беларусь цалкам адмовілася ад імпарту электрычнай энергіі, скараціла аб'ём увозу прыроднага газу.

**Забеспячэнне харчовай бяспекі краіны**

У глабальным рэйтынгу харчовай бяспекі Беларусь характарызуецца як краіна са спрыяльнымі ўмовамі забеспячэння насельніцтва харчаваннем. Вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі на душу насельніцтва ў Беларусі адпавядае ўзроўню развітых краін і па многіх пазіцыях перавышае паказчыкі, дасягнутыя ў краінах СНД. Беларусь не толькі цалкам пакрывае ўнутраныя патрэбы ў збожжы, свініне, агародніне, бульбе, раслінных алеях, цукры і яйках, але і трывала ўваходзіць у лік сусветных лідараў па экспарце прадуктаў харчавання.

**Развіццё IT-сферы**

Беларусь уваходзіць у лік сусветных лідараў па экспарце IT-паслуг. Мабільныя прыкладанні, створаныя рэзідэнтамі беларускага Парку высокіх тэхналогій, выкарыстоўваюць каля мільярда чалавек больш чым у 190 краінах свету.

Беларусь першая сярод краін СНД ажыццявіла поўны пераход на лічбавае эфірнае вяшчанне і паспяхова завяршыла тэсціраванне сеткі 5G. Рэсурсы апошняй адкрываюць перспектывы для развіцця інавацыйных праектаў: беспілотнага транспарту,

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ













*1. Прааналізуйце дыяграмы. На аснове прадстаўленых статыстычных даных зрабіце вывады наконт эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь.*

*2. Пра вырашэнне якіх задач, вызначаных у праграмах сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь, сведчаць прыведзеныя даныя?*

канцэпцыі «Разумны горад». У краіне імкліва развіваюцца тэхналогіі на базе штучнага інтэлекту. Беспілотныя лятальныя апараты «Бусел МКР» і «Гексакоптар-1», аснашчаныя найноўшым апаратна-праграмным комплексам айчыннай распрацоўкі,

дапамагаюць выяўляць узгаранні, ахоўваць дзяржаўную мяжу, змагацца супраць браканьераў і злачынцаў, шукаць людзей, якія заблукалі ў лесе.

Эканамічная інтэграцыя

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, складзіце схему па тэме «Эканамічная інтэграцыя».

Эканамічная бяспека

**4. Выклікі і пагрозы эканамічнай бяспецы.** *Эканамічная бяспека* — гэта стан абароненасці галін і сфер эканомікі ад уздзеяння пагроз, якія перашкаджаюць устойліваму сацыяльна-эканамічнаму развіццю Рэспублікі Беларусь. Яе структурнымі элементамі выступаюць фінансавая, харчовая, экалагічная,

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Абарона ад знешніх пагроз нацыянальнай бяспецы ў эканамічнай сферы забяспечваецца шляхам:

- правядзення шматвектарнай знешнеэканамічнай палітыкі;
- недыскрымінацыйнай інтэграцыі Рэспублікі Беларусь у глабальную эканамічную прастору праз развіццё супрацоўніцтва з міжнароднымі эканамічнымі арганізацыямі і інтэграцыйнымі аб'яднаннямі;
- удзелу ў міжнародных дамовах, накіраваных на скасаванне няроўных умоў у знешнім гандлі;
- умацавання пазіцый нацыянальных таваравытворцаў на знешніх рынках за кошт пашырэння таварнай наменклатуры і геаграфіі экспарту;
- пераарыентацыі экспартных плыняў на рынкі дружалюбных краін, выбудоўвання новых транспартна-лагістычных маршрутаў ва ўмовах увядзення абмежавальных мер асобнымі дзяржавамі або групамі дзяржаў;
- дыверсіфікацыі імпарту сыравінных і энергетычных рэсурсаў;
- імпартазамяшчэння, арыентаванага ў тым ліку на паскоранае развіццё нацыянальных і сумесных высокатэхналагічных вытворчасцей;
- дзяржаўнай інфармацыйна-юрыдычнай падтрымкі суб'ектаў гаспадарання ў прасоўванні прадукцыі на новых рынках збыту і пошуку партнёраў для вытворчай кааперацыі.

*Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, канкрэтызуйце фактамі кірункі абароны Рэспублікі Беларусь ад знешніх пагроз у эканамічнай сферы.*

вытворчая, навукова-тэхналагічная і інфармацыйна-прававая бяспека.

**Знешнія і ўнутраныя выклікі і пагрозы**

Напачатку 2020-х гг. наша краіна сутыкнулася з многімі знешнімі і ўнутранымі выклікамі і пагрозамі: пандэмія COVID-19, закрытыя межы, гандлёвыя бар'еры і абмежаванні, спроба дзяржаўнага перавароту, эканамічныя санкцыі з боку заходнееўрапейскіх дзяржаў, пагаршэнне ўмоў знешняга гандлю.

У сучасных геапалітычных рэаліях найбольш імавернымі выклікамі і знешнімі пагрозамі ў забеспячэнні эканамічнай бяспекі Рэспублікі Беларусь застаюцца:

- новая тэхналагічная рэвалюцыя, у аснове якой знаходзяцца эканоміка ведаў, эфектыўнасць выкарыстання чалавечага і навукова-тэхнічнага капіталу, пераход да нанатэхналогій, тэхналогій геннай інжынерыі, вадароднай энергетыкі, тэхналогій штучнага інтэлекту;
- рызыка новага сусветнага фінансавага і эканамічнага крызісу, звязанага са знешнеэканамічнай палітыкай ЗША і іх саюзнікаў, наяўнасцю велізарнага знешняга доўгу ў шэрагу краін;
- абвастрэнне энергетычна-сыравіннай і харчовай праблем у большасці развітых краін і краін, якія развіваюцца, на фоне ўскладнення барацьбы за новыя сыравінныя рынкі і эканамічную прастору — Арктыка, космас, марскія і акіянічныя рэсурсы;
- адсутнасць стабільнай сістэмы міжнароднай эканамічнай бяспекі і адпаведных эфектыўных міжнародных інстытутаў яе забеспячэння.

***Ва ўмовах распаду савецкай эканамічнай сістэмы Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка, па сутнасці, увёў у краіне антыкрызіснае кіраванне, здолеў захаваць эканамічны патэнцыял краіны. Мадэль сацыяльна арыентаванай рыначнай эканомікі, якая рэалізуецца ў Беларусі, даказала сваю жыццяздольнасць. Поўнай мерай забяспечваецца харчовая бяспека, дынамічна развіваюцца прамысловасць і сфера паслуг. Істотна ўмацаваўся ўзровень энергетычнай бяспекі. Эканоміка паступальна развіваецца, што забяспечвае павышэнне якасці жыцця беларускага народа. Ва ўмовах росту канкурэнцыі ў свеце вызначальнай для Беларусі робіцца стратэгія развіцця, арыентаваная на барацьбу за знешнія рынкі і стымуляванне ўнутранага спажывання.***

**калі ў свеце…**

2022 г. — амаль 258 млн чалавек у 58 краінах зазналі вострую нястачу харчавання (Глабальная справаздача аб харчовых крызісах — 2023)

**на тэрыторыі Беларусі…**

2023 г. — Беларусь уваходзіць у топ-5 краін-лідараў у экспарце малочнай прадукцыі. Айчынная прадукцыя пастаўляецца ў больш чым 100 краін свету

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Ахарактарызуйце беларускую мадэль сацыяльна-эканамічнага развіцця. Прывядзіце канкрэтныя прыклады праяўлення кожнай з яе прыкмет.
2. Складзіце ментальную карту «Дасягненні эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь». Якія фактары, на вашу думку, абумовілі поспехі ў эканамічным развіцці суверэннай Беларусі?
3. Назавіце асноўныя выклікі і знешнія пагрозы ў забеспячэнні эканамічнай бяспекі Рэспублікі Беларусь. Якія асноўныя кірункі абароны нацыянальнай бяспекі краіны ад знешніх пагроз у эканамічнай сферы?
4. У верасні 2022 г. А. Р. Лукашэнка адзначыў: «Нават ва ўмовах беспрэцэдэнтнага санкцыйнага ціску Беларусь паспяхова развіваецца. Асабліва гэта датычыцца традыцыйных для нас галін прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Мы здолелі пераарыентаваць экспарт, займаемся імпартазамяшчэннем, павялічылі пастаўкі ў Расію, Кітай і іншыя краіны». Прывядзіце доказы паспяховай рэалізацыі беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця, абапіраючыся на факты, прыведзеныя ў тэксце параграфа.
5. У чым заключаецца пераемнасць беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця з савецкай сацыяльна-эканамічнай сістэмай?
6. Якія эканамічныя дасягненні нашай краіны, на вашу думку, могуць быць прадметам гонару беларускага народа? Падрыхтуйце паведамленне-прэзентацыю пра іх.